*Сарокін А.М.,* доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі права Беларускага Інстытута правазнаўства

# ВЕКТАРЫ ПРАВАВОГА РЭГУЛЯВАННЯ АДНОСІН У БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ 1917–1921 гг.

Пры асэнсаванні пытання, якое разглядаецца ў гэтым артыкуле, варта ўлічваць: падзеі Кастрычніка 1917 г. паклалі пачатак развіццю якасна новых аграрных адносін на той тэрыторыі Беларусі, якая трапіла ў склад Беларускай ССР. Не будзем забываць і аб тым, што вырашэнне аграрна-сялянскага пытання (дарэчы, як і іншых) на гэтай тэрыторыі адбывалася на аснове ці пад уплывам права Расійскай Федэрацыі. Гэтаму спрыяла знаходжанне значнай часткі тэрыторыі Беларусі ў складзе Савецкай Расіі.

Зыходнай заканадаўчай базай па вырашэнню неадкладных праблем вёскі бальшавіцкай партыяй, як і крокаў па іх рэалізацыі, з'явіліся нормы Дэкрэта аб зямлі, прынятага II Усерасійскім з'ездам Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў у ноч з 26 на 27 кастрычніка 1917 г., Асноўны закон аб сацыялізацыі зямлі УЦВК ад 27 студзеня 1918 г., а таксама Палажэнне аб сацыялістычным землеўпарадкаванні і аб мерах пераходу да сацыялістычнага земляробства УЦВК (люты 1919 г.). На працягу пачатковага этапу савецкага грамадства выдаваліся і іншыя нарматыўныя прававыя акты РСФСР, накіраваныя як на ўлік прыёмаў і прынцыпаў папярэдняга развіцця расійскага грамадства, так і на ўкараненне або развіццё ўстановак новай улады.

У адпаведнасці са стратэгічнымі дакументамі цэнтральных органаў Савецкай Расіі па вырашэнню аграрна-сялянскага пытання беларускай рэспубліканскай і мясцовымі ўладамі быў распрацаваны шэраг актаў у іх развіцці – рэзалюцыі або тэзісы па зямельнаму і аграрнаму пытаннях I і II Усебеларускіх з'ездаў Саветаў (адпаведна 1919 і 1920 гг.), дакументы, што прымаліся народнымі камісарыятамі, мясцовымі Саветамі (абласцей, губерняў, паветаў, валасцяў) і іх структурнымі падраздзяленнямі, а таксама статутамі (прыгаворамі) грамадскіх вытворчых аб'яднанняў. Будзем памятаць і аб Канстытуцыі ССРБ 1919 г. (з дапаўненнямі 1920 г.)

Нялішне нагадаць, што ў тэкст Дэкрэта аб зямлі цалкам уключаны "сялянскі наказ" (п. 4). Гэты наказ, у сваю чаргу, быў распрацаваны эсэрамі ў адпаведнасці з іх праграмай вырашэння аграрнага пытаня. Яна, у прыватнасці, зыходзячы з радыкальных патрабаванняў сялянства, прадугледжвала канфіскацыю памешчыцкага землеўладання без выкупу і ўраўняльнае (роўнае) размеркаванне паміж сялянамі (па колькасці едакоў або рабочых рук у сям'і, гаспадарцы). Паказальна, што і У.І. Ленін не адмаўляў такога запазычання (ім гэта засведчана на II Усерасійскім з'ездзе Саветаў). Адсюль, здаецца, і заява на гэтым з'ездзе прадстаўніка фракцыі левых эсэраў А. Калягаева аб тым, што прапанаваны праект Дэкрэта аб зямлі яго фракцыя вітае як перамогу яе ідэі.

Ці азначала гэта, што аграрна-сялянскае пытанне атрымлівала аптымальнае вырашэнне? Далёка не так. Справа ў тым, што яно, як і аграрная палітыка, былі наскрозь ідэалагізаваны. У вырашэнне аграрнага пытання закладваліся негатыўныя вынікі для краіны сацыяльна-эканамічнага і палітычнага характару. Відавочна, што нацыяналізацыя ўсёй зямлі, прыватнай уласнасці наогул, прымяненне сілы да тых сялян, якія не адносіліся да працоўных, і спробы правесці калектывізацыю ў сціслыя тэрміны (за 3 гады), практыка пазбаўлення сялян права арганізоўваць вытворчасць у адпаведнасці з кан'юнктурай было не на карысць новай уладзе. Вынікі гэтага не прымусілі сябе чакаць. Нарастаючая прыярытэтная арыентацыя масавай свядомасці на непрыняцце папярэдняга айчыннага вопыту рэзка абвастрыла сітуацыю: грамадства ахапіла жорсткае супрацьстаянне розных сацыяльных сіл, безадказнае нецярпенне да процілеглай думкі і сляпы радыкалізм. Гэта павялічвала крызіс сельскай гаспадаркі, усяго грамадства.

Час паказаў: уяўленні правадыроў Кастрычніка аб магчымасці вырашэння задач сацыялістычнага парадку шляхам актывізацыі «класавай барацьбы» і «кавалерыйскай атакі на дробнабуржуазную стыхію» былі памылковымі. Імкненне бальшавікоў стварыць новы свет без дастатковай падрыхтоўкі простых людзей да яго ўспрыняцця сутыкнулася з іх супраціўленнем. Сяляне ў сваёй большасці не былі гатовымі да такіх метадаў савецкай улады. Аб гэтым сведчаць не толькі выказванні імі сваёй незадаволенасці новай уладай на з'ездах Саветаў, але і шырокая хваля стыхійнага ўзброенага руху. Ім была ахоплена, падкрэслім, тэрыторыя Беларусі, падуладная бальшавікам.

Згубныя вынікі такіх дзеянняў хутка прызналі лідэры рэвалюцыі. Нагадаем аб іх, бо апошнім часам рэдка пачытаеш у друку, як самі бальшавіцкія лідэры тлумачылі свае паводзіны. Гэта трэба ведаць, бо менавіта яны кіравалі рэвалюцыяй. У. Ленін сведчыў: «Сегодня только слепые не видят, что мы больше нанационализировали, наконфисковали, набили и наломали, *чем успели подсчитать*». «Мы в этом отношении очень много погрешили, идя слишком далеко... по пути национализации торговли и промышленности, по пути закрытия местного оборота...

В этом отношении нами было сделано много просто ошибочного, и было бы величайшим преступлением здесь не видеть и не понимать того, что мы меры не соблюли, не знали, как ее соблюсти» [1, с.294; 2. с.63]. Хаця ў вёсцы такое «просто ошибочное» знайшло, будзем справядлівымі, трывалую падтрымку ў люмпенізаванай масы, якая яднался вакол харчатрадаў, камітэтаў беднаты і партыі ўлады.

Цікава таксама ўстаноўка Другой Устаўной граматы Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) ад 9 сакавіка 1918 г. Паводле яе «... права прыватнай уласнасці на зямлю касуецца. Зямля перадаецца без выкупу тым, якія самі на ёй працуюць». Лес, воды і нетры зямлі абвяшчаліся ўласнасцю БНР [3, с.112].

Разам з тым мэтазгоднасць гэтай меры ў той час, гады перабудовы і ў постсавецкіх умовах ставіліся (і ставяцца) пад сумненне шматлікімі палітыкамі і вучонымі. Аднак не будзем забываць, што ў свой час такі характар адносін да прыватнай уласнасці на зямлю быў даволі тыповым сярод партый і рухаў нават умерана-сацыялістычнай арыентацыі. Праўда, яны з'яўляліся прыхільнікамі вырашэння пытання не столькі радыкальнымі рэвалюцыйнымі метадамі, колькі шляхам рэформ [4, с.29 50–54, 76, 89; 5, с.23].

Адсюль неперакanaўчa тое сцвярджэнне, што вытокі ўсіх наступных хвароб у аграрным сектары былі закладзены ў Дэкрэце аб зямлі. Яны хутчэй за ўсё знаходзяцца ў далейшай практыцы вырашэння аграрных праблем, падагнаных ваеннымі падзеямі і перарослай у «кавалерыйскую (чырвонагвардзейскую) атаку на капітал». Асабліва гэта праяўлялася ў дзеяннях новай улады па пазбаўленню сялян права распараджацца вынікамі сваёй працы на зямлі. З іншага боку, пазіцыя Выканкама Рады БНР адносна лёсу прыватнай уласнасці на зямлю – пэўнае сведчанне імкнення апазіцыйных уладзе сіл да супрацоўніцтва.

Пры ўсім тым праведзеная нацыяналізацыя і калектывісцкія арыенціры партыі ўлады напачатку ў цэлым не выклікалі асаблівай заклапочанасці ў сялянскіх мас (дарэчы, як і ўзважанага іх асэнсавання ў колах партыйна-палітычнай эліты, палітычна актыўнай часткі грамадства). Нельга не лічыцца і з той стратэгічнай устаноўкай Кастрычніцкай рэвалюцыі, у якой вёсцы, сялянству адводзілася другарадная роля ў развіцці грамадства. Захапленне ёю, часам нават да маніякальнасці, абярнулася, гаворачы словамі сучаснага расійскага гісторыка І. Фраянава, бесцырымоннымі адносінамі да сваёй краіны і народа, ашаламляльна радыкальнымі і такімі ж безразважнымі эксперыментамі. Пэўным вынікам гэтага стала палітыка ваеннага камунізму, якая падняла сялянства «на дыбы» [6, с.3]. З ёю звязаны настойлівыя спробы арыентацыі практыкі грамадскага жыцця на ўкараненне сацыялістычнай адзінаўкладнасці (у тым ліку праз рэалізацыю планаў калектывізацыі) і нівеліраванне сялянства пры знішчэнні параўнальна развітых яго груп.

Як паказала жыццё, сапраўдны гістарычны працэс непамерна больш складаны. Дастаткова нагадаць, што ў развітых краінах суіснуюць розныя формы ўласнасці і тыпы гаспадарак на вёсцы. Пры гэтым асноўнымі вытворцамі сельскагаспадарчай прадукцыі з'яўляюцца буйныя фермы з наёмнай працай, эфектыўнасць якіх вышэй за дробных. Прычым на аснове канцэнтрацыі дробныя фермы выціскаюцца больш буйнымі. Так, за 50-я–80-я гады XX ст. у Францыі і ЗША іх колькасць зменшылася прыкладна ў тры разы. У 80-я гады ў Даніі буйныя фермы (плошча звыш 50 га) за гадзіну атрымлівалі прыбытку ў 19 разоў больш, чым дробныя (плошча 5–10 га). У 1988 г. у ЗША толькі 15% фермерскіх гаспадарак далі 75% усёй сельскагаспадарчай прадукцыі. Да 25% усёй таварнай прадукцыі забяспечвалі буйнейшыя фермы, доля якіх складала 1,3% ад агульнага ліку ферм. Разам з тым не будзем забываць (як гэта мела месца ў савецкай, ды і постсавецкай гісторыяграфіі), што ва ўмовах шматукладнасці буйныя гаспадаркі і на прасторах Беларусі дэманстравалі больш высокую эфектыўнасць вытворчасці ў параўнанні з большасцю гаспадарак. Праўда, афіцыйная беларуская гісторыяграфія гэтае сцвярджэнне сур'ёзна не абгрунтоўвае [5, с. 12, 190–191, 196–197].

Нельга не сказаць і аб тым, што ў характары рэалізацыі савецкіх пераўтварэнняў не было асабліва спецыфічнага савецкага (насуперак распаўсюджанай у айчыннай да і замежнай свядомасці думкі). Справа ў тым, што падобнае мела месца не толькі ў СССР. Для таго каб не было такога, аб ім неабходна гаварыць. Гэта былі, як высвятляецца, спробы спалучэння новай улады «незападного» утапічнага мыслення з еўрацэнтрызмам, са спадзяваннем на тое, што заходнія прыёмы і мадэлі лёгка пераносяцца на любую іншую культурную глебу. Іначай кажучы, улада абазначала арыентацыю на заходнюю цывілізацыю. Выходзіць, без пераймання вопыту рэвалюцыйных рэжымаў, якія ўстанаўліваліся ў краінах Заходняй Еўропы ў выніку палітычных узрушэнняў XVI–XIX стагоддзяў, па выкарыстанню метадаў дзяржаўнага прымусу для змянення структуры ўласнасці, у тым ліку і зямельнай (не толькі ўласнасць царквы або прадстаўнікоў «варожых класаў», але і ўласнасць простых сялян) без засваення палымянымі расійскімі (савецкімі) рэвалюцыянерамі, гэта значыць людзьмі, якія прымалі дзяржаўныя рашэнні, заходнееўрапейскай культуры (пераважна рэвалюцыйнай міфалогіі, асабліва марксісцкай), паяўленне і развіццё новага грамадскага ладу на прасторы Расійскай імперыі ў XX стагоддзі цяжка ўявіць. Аўтарам савецкага ўпарадкаванага дзяржаўнага тэрору, жорсткай індустрыялізацыі і пераважна гвалтоўнай калектывізацыі было на каго раўняцца. Таму ёсць глыбокі сэнс у тым назіранні выдатнага рускага мысліцеля А. Зіноўева аб тым,

што «советское общество появилось и развивалось в рамках западноевропейской цивилизации... А советский (чытаем, і беларускі. – *А.С.*) человек – человек западноевропейской культуры» [7, с.3].

Разам з тым нацэленасць бальшавікоў на заходнееўрапейскі рэвалюцыйны вопыт, матэрыялізацыю радыкальных догмаў марксізму дала і станоўчыя вынікі. Адносна сялянства гэта перш за ўсё тое, што да 1921 г. зямлю атрымалі не менш 1/3 сялянскіх гаспадарак Беларусі, а да 25% бядняцкіх па плошчы замлекарыстання сталі серадняцкімі. Адсюль асноўную группу сялянства сталі складаць серадняні (якія, праўда, з улікам перэпетый часу сваім эканамічным узроўнем нагадвалі дарэвалюцыйную беднату). Былі закладзены прынцыпы калектыўнага вядзення найбольш развітых і насычаных перадавой па тым часе тэхнікай гаспадарак. Нарэшце, на фоне актыўнай дзяржаваўтваральнай дзейнасці бальшавікоў была ўтворана Беларуская ССР. Тым самым стварыліся ўмовы для больш поўнага задавальнення інтарэсаў этнасаў, якія насялялі Беларусь, змякчэння сацыяльнай напружанасці ў грамадстве і кансалідацыі палітычных сіл на платформе стварэння. Належнае асэнсаванне іх дазваляе лепш зразумець правамернасць сённяшніх рашэнняў, іх перспектыўнасць.

## ЛИТЕРАТУРА


1. Ленин В.И. О «левом ребячестве» и о мелкобуржуазности // Полн. собр. соч. Март–июль 1918. М.: Политиздат, 1962. Т. 36. С. 283–314.
2. Ленин В.И. X съезд РКП (б) 8–16 марта 1921 г.: Доклад о замене развёрстки натуральным налогом // Полн. собр. соч. Март–июль 1921. М.: Политиздат, 1963. Т. 43. С. 57–73.
3. Турук Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белоруссов. Мінск, 1994.
4. Палітычныя партыі Беларусі. Мінск: Згода, 1994.
5. Сарокін А.М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска: Ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917–1990-я гады). Мінск: Права і эканоміка, 1999.
6. Фроянов И. Революция для России // Литературная газета. 2007. 29 августа – 4 сентября (№ 33–34). С.3.
7. Громов С. Постсоветизм во мгле: Беседа с философом, социологом, писателем Александром Зиновьевым о социальной системе, сложившейся после развала Советского Союза // Литературная газета. 2005. 5–11 октября (№ 41). С.3.


## РЭЗЮМЕ

Праз аналіз першых стратэгічных заканадаўчых актаў Савецкай улады па праблемах вёскі, крокаў па іх рэалізацыі ў Беларусі выяўлена іх уздзеянне на працэс кансалідацыі палітычных сіл і сацыяльна-класавых груп, развіццё грамадства. Праводзіцца думка аб мэтазгоднасці суіснавання розных форм уласнасці і тыпаў гаспадарак на вёсцы, непазбежнай канцэнтрацыі вытворчасці вакол буйных гаспадарак як больш эфектыўных, чым дробныя. Упершыню ў айчыннай гісторыка-прававой літаратуры звернута ўвага на неабходнасць пазнання агульнага ў практыцы савецкіх пераўтварэнняў і вопыце рэвалюцыйных рэжымаў краін Заходняй Еўропы.

## SUMMARY

Through the analysis of the first strategic legislative acts of the Soviet government on the problems of the village and the steps of their implementation in Belarus the influence of these acts on the process of consolidation of political forces and social classes and the development of society is revealed. The idea about the expediency of the mutual existence of various forms of property as well as production types in the village and the inevitable concentration of industry around strong productions which are more effective than the small ones is developed. For the first time in domestic historical legal literature the attention is turned to the necessity of learning the generalities between the practice of soviet reorganization and the experience of revolutionary regimes in the countries of Western Europe.